Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Беларусі асудзілі трох чалавек, затрыманых трэцяга ліпеня

06.07.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў

Шостага ліпеня ў Магілёве, Маладзечне і Гродне прайшлі суды над затрыманымі трэцяга ліпеня падчас святкавання Дня незалежнасці. Тры чалавекі ўсе выходныя правялі ў ізалятарах у чаканні судовых пасяджэнняў.

Магілёў

Глеба Будкова затрымалі каля 16 гадзін дня 3 ліпеня каля ГЦ «Атрыум», паведамляе mspring.online. Сябар Будкова паведаміў праваабаронцам «Магілёўскай вясны», што падставай для затрымання стаў бел-чырвона-белы сцяг, які малады чалавек навязаў на сваіх плячах. На Будкова склалі пратакол за арганізацыю несанкцыянаванага масавага мерапрыемства (ч. 2 арт. 23.34 КаАП) і трое сутак пратрымалі ў ізалятары часовага ўтрымання.



Глеб Будкоў у судзе

На разглядзе справы, які прайшоў у судзе Ленінскага раёна Магілёва, хлопец патлумачыў, што павязаў на плечы бел-чырвона-белы сцяг, каб выказаць салідарнасць з цемнаскурымі людзьмі, якія сутыкаюцца з дыскрымінацыяй.

> *"Я павязаў бел-чырвона-белы сцяг у Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь і збіраўся так праносіць яго да 4 ліпеня – Дня незалежнасці ЗША"*, – растлумачыў на судзе Будкоў.

У выніку суддзя **Вікторыя Палякова** накіравала справу назад у РАУС на дапрацоўку.



"Нам далі распараджэнне такіх затрымліваць". Затрыманні 3 ліпеня ў Беларусі

3 ліпеня ў Беларусі святкуюць Дзень незалежнасці. У розных сацыяльных сетках людзей заклікалі выйсці на галоўныя вуліцы гарадоў і выказаць нязгоду з тым, як праходзіць выбарчая кампанія ў Беларусі. Міліцыя пачала затрымліваць людзей. Агулам 3 ліпеня па ўсёй Беларусі было затрымана мінімум 17 чалавек.

Гродна

Затрыманага трэцяга ліпеня каардынатара ініцыятыўнай групы Святланы Ціханоўскай са Скідзеля **Яўгена Клімука** аштрафавалі на **15 базавых велічынь (405 рублёў)** таксама за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах.

Маладзечна

Толькі праз тры дні пасля інцыдэнту праваабаронцам стала вядома пра затрыманне трэцяга ліпеня **Аляксандра Новіка.** Па інфармацыі ад яго знаёмых, Новік пайшоў у парк Перамогі і вырашыў зрабіць фотаздымак машыны з АМАПам. У выніку яго затрымалі і склалі пратакол аб непадпарадкаванні супрацоўнікам міліцыі (арт. 23.4 КаАП). У судзе шостага ліпеня суддзя Інэса Южык прыняла рашэнне аштрафаваць Новіка на **10 базавых велічынь (270 рублёў).**

Навагрудак

У гэты ж дзень, шостага ліпеня, у раённым судзе Навагрудка 10 базавых штрафу атрымаў **Юрый Каладко** - за ўдзел у мясцовым "Ланцугу салідарнасці".

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску


#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў

рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY